**Іванова С. А.,**
*мастак-рэстаўратар Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту,*

**Міцкевіч А. І.,**
*старшы выкладчык Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў*

# ПЫТАННІ АТРЫБУЦЫІ АБРАЗА БАГАРОДЗІЦЫ «НЕЧАЯННАЯ РАДОСТЬ» З КАЛЕКЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МУЗЕЯ НАРОДНАЙ АРХІТЭКТУРЫ І ПОБЫТУ (2008 г.)

У 2005 г. у рэстаўрацыю паступіў абраз «Нечаянная радость» (уліковае абазначэнне НД 5971), які экспанаваўся ў інтэр'еры архітэктурнага помніка «Школа» з в. Калодчына. Для выбару правільнай праграмы рэстаўрацыі неабходна максімальна дакладная атрыбуцыя помніка. Паводле звестак з кнігі ўліку навукова-дапаможнага фонду абраз датаваны канцом XIX ст. і атрыбутаваны наступным чынам:

Абраз «Нечаканая радасць Прачыстай Багародзіцы»: выкананы на адной дошцы з верхняй уразной шпонкай. Багародзіца ў левай частцы абраза з Хрыстом на руках, які правай рукой благаслаўляе. Справа ад іх постаць укленчанага чалавека на прыступках пабудовы з вітым слупам-калонаю і невялікім акенцам. Абраз пад акладам з белага металу, на якім выціснута адзенне персанажаў. Выява пабудовы: німбы над галовамі Багародзіцы і Хрыста ў выглядзе зорных прамянёў, раслінна-геаметрычны арнамент па краях і кутах, і надпіс кірылічнымі літарамі пад выявай Багародзіцы.

Тэхніка выканання: дрэва, алей, метал. Памеры: 31х25 см.

Захаванасць: адзінкавыя трэшчыны і сколы дошкі, фарбавага слою; аклад часткова дэфармаваны, са слядамі паціны, а па краях і на задняй сценцы адтуліны ад цвікоў і сляды шашаля.

*Акт № 21 ад 27.03.1996 г. Набыты галоўным захавальнікам Малюшынай В. А. у Пекарчыка В. Г. г. Мінск.*

Пры візуальным аглядзе былі выяўлены неадпаведнасці:
— дошка склеена з чатырох частак;
— дошка замацавана дзвюма ўразнымі тарцовымі шпонкамі;
— жывапіс тэмперны;
— аклад: латунь, серабрэнне, ручная чаканка;
— неапісаныя надпісы з тыльнага боку, на акладзе.

Пасля вывучэння даступных іканаграфічных крыніц і падчас візуальнага і мікраскапічнага абследавання ўдалося высветліць наступнае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1. Удакладненне іканаграфіі*

Абраз «Нечаянная радость» мае амебейную (колавую) кампазіцыю — ікона ў іконе: у верхнім правым куце змешчаны абраз Багародзіцы, які адносіцца да іканаграфічнага тыпу Адзігітрыя. Хрыстос на абразе Багародзіцы трымае рукі не ў жэсце блаславулення, як падаецца ва ўліковых дакументах, а ў жэсце адарацыі (лат. *adoratio* «пакланенне»), які азначае малітоўны зварот да Бога.

Гэты адзін з абразоў Багародзіцы, які напісаны на падставе літаратурнай крыніцы — казання свяціцеля Дзмітрыя Растоўскага, якое ўвайшло ў кнігу «Руно орошенное». Цудадзейны арыгінал абраза вядомы з 1835—37 гг. або з 1838 г.

*2. Тэхніка выканання*

__Аснова:__ 4 склееныя бярозавыя дошкі, 2 тарцовыя ўразныя шпонкі. Драўніна рыхлая, трэшчыны ў месцах склейкі, па вуглах, на тарцах, у месцах страты ляўкасу. Дошка дэфармаваная: велічыня прагібу з тыльнага боку 1 см, вертыкальная зона дэфармацыі даўжынёй 10 см (у месцы выявы ўкленчанага чалавека). Сляды былой жыццядзейнасці жукоў-тачыльшчыкаў. На тыльным баку абраза надпісы (прадрапаны: «**Илья Николаев**»; тушшу: **№ 86** (правы верхні вугал) і па сярэдзіне поля ў разбіўку: **4 нечаяну 20 р чек(л)** і інш.), якія патрабуюць асобнага даследавання.

__Ляўкас:__ аўтэнтычны — мел з глютынавым клеем. Дробныя страты па апушцы і палях. У ніжняй частцы абраза — панаўленне грунту, якое закранае палі, апушку, сярэднік, часткова пазём. У зоне панаўлення грунт у адрозненні ад аўтэнтычнага буйназярністы, шэры, са шматлікімі дробнымі стратамі. Кансістэнцыя рыхлая, паверхня няроўная, крохкая.

__**Фарбавы слой:**__ тэмперны жывапіс. На выяве ўкленчанага чалавека рэзкі ізлом даўжынёй 10 см з дробнымі стратамі ляўкасу і фарбы. Вертыкальныя трэшчыны на верхнім полі абраза.

__**Ахоўнае пакрыццё:**__ паверхня абраза і панаўлення пакрыта сінтэтычным лакам. Пакрыццё няроўнае, збеглае ў плямы.

__Аклад:__ мае абарваны надпіс: «человекъ некій беззаконникъ но имеаше правила молитиса къ Пр. Богородице и п...»

*3. Мікраскапічнае даследаванне*

Несупадзенне прорысу і жывапісу, адсутнасць крыжа ў німбе Хрыста, а таксама несупадзенне надпісу на абразе і акладзе, адсутнасць залачэн-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня, адсутнасць прабелаў у далічным, вахрэння і двіжкоў на лічным пісьме, папера ў якасці паволокі дазваляюць меркаваць, што гэты абраз — рамесніцкі выраб.

У зоне панаўлення былі зроблены тонкія папярэчныя зрэзы. Даследаванне ў адбітым святле з выкарыстаннем бінакулярнага мікраскопа МБС-1 і лічбавай камеры Nikan паказала наступнае: месцамі пад паперай назіраюцца слаі панаўлення грунту. Таксама на верхняй граніцы панаўлення можна ўбачыць слаі аўтэнтычных фарбы і лаку, запісаныя пазнейшай таніроўкай і сінтэтычным лакам. У якасці паволокі выкарыстана тэкстыльная папера — пад мікраскопам добра відаць рознакаляровыя тэкстыльныя валокны. Гэта пацвярджае папярэдняе меркаванне пра рамесніцкае паходжанне абраза, бо толькі рамеснікі-іканапісцы XVIII—XIX стст. наклейвалі тэкстыльную паперу, больш танную, замест ільняной тканіны, да сярэдзіны XIX ст.

Улічваючы час з'яўлення цудатворнага абраза (1835—1838) і пашырэнне яго копій, а таксама час выкарыстання тэкстыльнай паперы ў якасці паволокі, можна выказаць меркаванне пра змену дацiроўкі і аднесці стварэнне абраза да часовага прамежку з 1838 па 1850-я гг.

*Літаратура*


Кніга ўліку навукова-дапаможнага фонду.

*Яскевіч, А.* Падзвіжнікі і іх святыні / А. Яскевіч. – Мн.: Полымя, 2001.

*Алексеев, С. В.* Зримая истина. Энциклопедия православной иконы / С. В. Алексеев. – СПб.: Нева; М.: Олма-пресс, 2003.

Земная жизнь Пресвятой Богородицы и описание святых чудотворных Её икон / сост. С. Снессорева. – М.: Храм Софии Премудрости Божией в Средних Садовниках, 2006.

Реставрация станковой темперной живописи: учебник / под ред. Филатова В. В. М.: Изобраз. искусство, 1986.

*Алексеев, С. В.* Энциклопедия православной иконы. Основы богословия / С. В. Алексеев. – СПб.: Сатись, 2001.

История иконописи VI–XX веков. – М.: АРТ-ГМБ, 2002.

*Кондаков, Н. П.* Иконография Богоматери. Связи греческой и русской иконописи с итальянской живописью раннего Возрождения / Н. П. Кондаков. – М.: Паломник, 1999.

Монахиня Иулиания (М. Н. Соколова). Труд иконописца. – Свято-Троицкая Сергиева лавра, 1995.

*Успенский, Л.* Богословие иконы / Л. Успенский. – М.: Паломник, 2001.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ